# “Сцежкамі роднага краю”: віртуальная экскурсія па тэрыторыі Валішчанскага сельскага савета

**А. П. Бунькевіч,**
настаўнік гісторыі і грамадазнаўства вышэйшай катэгорыі
Валішчанскай СШ Пінскага раёна

У працэсе інавацыйнай дзейнасці шмат увагі надавалася вырашэнню праблемы фарміравання каштоўнасцей навучэнца як асобы, развіцця этнакультурнай кампетэнцыі, спалучаючы духоўна-культурную спадчыну і лепшыя навуковыя і практычныя педагагічныя здабыткі.

Прапаную вашай увазе распрацоўку заняткаў па інтарэсах “Мой край і Я!” па тэме**.**

*Мэта*: вывучэнне гісторыі малой радзімы, абуджэнне цікавасці і беражлівых адносін да гістарычных і культурных каштоўнасцей, выхаванне цікавасці і любові да малой радзімы; распрацоўка экскурсійнага маршруту, які спрыяе фарміраванню ўстойлівай сеткі ўнутраных экскурсійных маршрутаў на тэрыторыі Валішчанскага сельскага савета.

*Задачы:*

- садзейнічаць прыцягненню ўвагі да гістарычнай спадчыны грамадскасці, мясцовых жыхароў, дзяржаўных органаў, сродкаў масавай інфармацыі;
- развіваць уменне аналізаваць атрыманы матэрыял і выкарыстоўваць яго на ўроках гісторыі, літаратуры і на пазаўрочных мерапрыемствах;
- фарміраваць пачуццё нацыянальнай годнасці і гонару за свой край, дапамагчы ўсвядоміць сваю ролю ў жыцці малой радзімы.

*Форма урока*: урок- экскурсія.

*Абсталяванне:* план-маршрут, мультымедыйная ўстаноўка, экран, камп'ютар, запіс музыкі Ігара Лучанка "Мой родны кут"

**Ход занятку**

1. **Арганізацыйны момант.**
2. **Вызначэнне тэмы і мэты**

**Настаўнік.** Пачнём занятак радкамі нашай зямлячкі, беларускай паэткі Марыі Кобец (на фоне песні "Мой родны кут" Ігара Лучанка гучыць верш

"Радзіма мая малая") (верш чытае вучаніца)

Мне неба таваё найясней,

Радзіма мая малая!

Смарагдавай ранняй вясне,

Вясковай тваёй, прысягаю!

Вы здагадаліся, аб чым пойдзе размова на нашым занятку? (адказы вучняў). Сапраўды, сёння мы з вамі здзейснім віртуальнае падарожжа па мясцінах нашай малой радзімы, якая знаходзіцца ў самым цэнтры беларускага Палесся.

Як вы думаеце, навошта патрэбна вывучаць гісторыю свайго роднага краю? (Адказы вучняў. Пад кіраўніцтвам настаўніка навучэнцы вызначаюць тэму і мэту занятку.)

Ітак, зараз мы з вамі адправімся ў падарожжа па родных мясцінах, дзе вы сустрэнецеся з цікавымі людзьмі, успомніце гісторыю нашай вёскі, пазнаёміцеся з матэрыяльнай і духоўнай спадчынай малой радзімы, падзеямі Першай сусветнай і Вялікай Айчыннай войнаў, мірнага часу і прыродным асяроддзем. Але, каб пераходзіць з адной старонкі на другую, мне патрэбна дапамога тых вучняў, якія не першы год наведваюць аб'яднанне па інтарэсах "Мой край і Я!" і з задавальненнем пакажуць вам шлях у мінулае.

Такім чынам, адпраўляемся. Адкрываем 1- ю старонку.

**Вядучы 1.** *(вучань 8 класа, свае словы суправоджае паказам прэзентацыі)*

“Радзіма”, “родная зямля”, “родны край” ... Гэтыя паняцці перш за ўсё абазначаюць тое ці іншае месца на Зямлі, тую ці іншую тэрыторыю, дзе адчуваеш сябе ў сваім асяроддзі, дзе людзі, якія цябе акружаюць, гавораць на роднай для цябе мове, блізкія табе па ладзе жыцця, культуры, звычаях, светапоглядзе.

*Сёння мы одправімся ў віртуальнае падарожжа па нашых родных мясцінах. Наш шлях ляжыць па маршруце:*




1. Вёска Валішча;
2. Месца былога маёнтка Лявона Краскоўскага;

3.-3.7. Агінскі канал – фрагменты нямецкай лініі ўмацавання ўздоўж Агінскіга канала 1915-1918 гг. – пахаванне падчас Першай сусветнай вайны;

4. Безыменная магіла авіятара;
5. Помнік ахвярам Вялікай Айчыннай вайны каля в. Клятная;
6. Вёска Вулька Лаўская – помнік Пятру Фёдаравічу Бандарчуку;
7. Помнік загінуўшым у гады Вялікай Айчыннай вайны;
8. Помнік Васілю Уладзіміравічу Хараўцу на старых могілках в.Валішча;
9. Царква Успення Найсвяцейшай Багародзіцы.

**Вучань 1.** Між лугоў шырокіх і лясоў зялёных,
Пасярод палескай, вольнае зямлі.
Ты стаіш прывольна, роднае Валішча,
А вакол квітнеюць роўныя палі.
Ты багата хлебам, малаком і мясам,
Добра родзіць бульба, лён і буракі.

А яшчэ багата роднае Валішча

Чыстымі дамамі, добрымі людзьмі.

Так пра нашу вёску піша ветэран педагагічнай працы, былая настаўніца пачатковых класаў Лявошка Марыя Канстанцінаўна.

Упершыню вёска Валішча згадваецца ў 1558 годзе як урочышча ў каралеўстве пушчы, дзе адбываліся “ловы пінскія”. Апошнім уладальнікам маёнтка быў Лявон Краскоўскі.



*На гэтым месцы амаль сто год назад быў маёнтак Краскоўскага.*

Існуе 3 легенды паходжання вёскі, у адной з іх говорыцца.

Наша вёска заснавана даўно. Ніхто і не памятае, які чалавек першым вырашыў тут будавацца і асесці назаўсёды. Але вядома, што людзі не надта сюды імкнуліся, бо месца не вельмі прыдатнае для жылля. Самі мяркуйце, прыгожае яно-то прыгожае, але ж балаціны, камары, іншы гнюс. Усё гэта даволі доўгі час адпужвала людзей. Пасяліўся там пан Зельскі з некалькімі парабкамі. І вось быў моцны ўраган, разбурыў усе іх пабудовы. А людзі, якія засталіся, паўцякалі на балоты ў заваліўшчы. Сталі яны расчышчаць тое “заваліўшча”, і нарадзілася вёска Валішча.

У тыя далёкія часы наша вёска знаходзілася вакол балот і лясоў, таму з таго часу засталася вялікая колькасць легенд аб паходжанні навакольных мясцін і ўрочышч.



**Вучань 2.** *А зараз мы з вамі знаходзімся каля Агінскага канала.*

Непадалёку ад нашай вёскі працякае Агінскі канал. Сама ідэя пабудовы канала належала не Міхаілу Казіміру Агінскаму, а другому буйному беларускаму магнату Багуславу Радзівілу. У “Інфармацыі дамашняй і палітычнай”, якую ён напісаў для сваіх нашчадкаў, можна прачытаць наступнае: “Калі б хто з нашчадкаў маіх хацеў бы пакінуць пра сабе памяць, то няхай закончыць ці распачне тое, што я хацеў паспрабаваць, а менавіта Днепр з

Нёманам злучыць праз раку Лошу. Запэўніваю, што ён зробіць справу, вартую памяці”.

Гэтую ідэю падхапіў і ўвасобіў у жыццё Міхаіл Казімір Агінскі, затраціўшы на будаўніцтва канала 12 мільёнаў злотых.  З ім адбыўся вельмі цікавы выпадак у час паездкі па палескіх уладаннях. Гэта было ў 1748 годзе. На другі дзень калядных святаў Агінскі не захацеў прысутнічаць на імшы ў простай вясковай святыні і прадоўжыў сваё падарожжа, у час якога карэта маладога Агінскага з каштоўным багажом ехала па дрэннай дарозе і на зусім расхістаным мосце звалілася ў рэчку, што нанесла яму страты ў некалькі тысяч дукатаў. Такое непрыемнае сутыкненне з рэчаіснасцю палескіх вясковых дарог, без сумнення, дало ў будучым канкрэтныя, пры тым неацэнныя вынікі, да аднаўлення ўсяго Пінскага Палесся.

Вялікая заслуга ў будаўніцтве гэтай воднай сістэмы належала Марціну Бутрымовічу, пінскаму мечніку і гарадскому суддзі, які з 1767 года быў ля двара гетмана, а потым дэпутатам чатырохгадовага сейма, арандатарам значнай часткі палескіх маёнткаў гетмана. Менавіта Марціну Бутрымовічу выпала ўся тая чорная праца, якая звязана з будаўніцтвам. Ён пастаянна працаваў са сваімі падначаленымі, а гэта мясцовыя і запрошаныя спецыялісты з іншых краін. Асноўная ж рабочая сіла – гэта сяляне з навакольных вёсак.

Большая частка канала праходзіла праз балоты, таму ўмацоўваліся берагі бярвеннямі, каб не абвальваліся і каб вада, якая збіраецца ў канале, не знікла праз бакавы грунт.

Пра цяжкасці гаварыць не прыходзіцца, бо іх пры ручной працы не толькі многа, а вельмі шмат. Гэта 47 кіламетраў земляных работ. Дарэчы, шырыня канала па дне складала 10 метраў. Ён прайшоў праз раку Лошу і два возеры – Вулька-Целяханская і Выганашчанскае. Першае невялікае (звыш 900 квадратных метраў), неглыбокае, з пясчанымі берагамі. А другое – вялікае (плошча яго 26 квадратных кіламетраў), самая вялікая глыбіня – 2.3 метры, а сярэдняя – 1.6 метраў. Размешчана сярод лесу, берагі балоцістыя і летам



зарастаюць чаротам, трыснягом, белымі і жоўтымі гарлачыкамі, іншай раслiннасцю. Агінскі канал перасякае возера з поўначы на поўдзень.

**Вядучы 3.**

*Наш шлях ляжыць уздоўж Агінскага канала, дзе да нашых дзён засталіся доты Першай сусветнай вайны.*

У Першую сусветную вайну па Агінскім канале ішла лінія абароны, і, вядома, многія збудаванні на канале былі разбураны або пашкоджаны. Царская армія адступала, і летам 1915 года тут з'явіліся немцы. Яны пачалі ўмацоўваць сваю лінію абароны. На заходнім беразе канала былі пабудаваны сотні жалезабетонных бліндажоў, штабных, баявых і гаспадарчых. На ўчастку Целяханы–Азарычы іх налічвалася звыш 30. Паміж шэрымі бункерамі былі выкапаны ў чалавечы рост акопы.

Каб знянацку не прарвалася сюды руская кавалерыя, на сярэдзіне канала была нацягнута драцяная сетка вышынёй два метры, апоры – металічныя слупы. Лінія абароны рускай арміі ішла паралельна Агінскаму каналу, прыкладна на адлегласці аднаго кіламетра. Акрамя канала, як перашкоды, яшчэ былі зроблены загароды з калючага дроту.

У Расіі адбылася Кастрычніцкая рэвалюцыя, уладу захапілі бальшавікі. У 1918 годзе ў Германіі таксама адбылася рэвалюцыя. Гэтыя падзеі і паўплывалі на адступленне немцаў. Неўзабаве на змену ім у зону Агінскага канала прыйшлі палякі. Лінія абароны абодвух варожых бакоў засталася ранейшая.

18 сакавіка 1921 года была заключана мірная дамова паміж Польшчай і Расійскай імперыяй, па якой Заходняя Беларусь аказалася пад уладай польскіх паноў. Яны ператварылі яе ў сваю калонію і называлі "крэсамі ўсходнімі". Тут яны панавалі да 17 верасня 1939 года.

За гады ваенных дзеянняў некаторыя збудаванні на канале былі разбураны. Але так як былі бетоннымі, таўшчыня іх сцен дасягала двух метраў, многія доты захаваліся і да нашых дзён. Палякі аднавілі канал, і ў 1926 годзе ён зноў уступіў у строй, стаў ранейшай жывой воднай артэрыяй, па якой пайшлі баржы, параходы, пачалі сплаўляць лес.

У сённяшні час Агінскі канал – невялікая рачулка, якая мае больш сельскагаспадарчае значэнне. Агінскі канал багаты рыбай, тут будуюць свае дамы бабры і гняздуюцца розныя птушкі.

**Вядучы 4.**

Падчас Першай сусветнай вайны на тэрыторыі цяперашняга Пінскага раёна ішлі разлютаваныя баі. З абодвух бакоў палеглі тысячы салдат і афіцэраў. Пра тыя бітвы сёння ў населеных пунктах раёна і лясах нагадваюць воінскія пахаванні, у якіх часта спачывае прах як нямецкіх, так і рускіх салдат. Спачатку за імі ажыццяўляўся догляд. Затым наступіў перыяд забыцця і разграблення. З месцаў пахавання вывозіліся надмагільныя пліты, разбіваліся ўсталяваныя тут агульныя абеліскі, магілы разрываліся з мэтай знайсці ў іх зброю, узнагароды і іншыя асабістыя рэчы нябожчыкаў.

Пахаванне знаходзіцца ў лесе непадалёку ад паўночна-заходняй ускраіны вёскі Азарычы.

Воінскія могілкі ўтварыліся тут з прыходам Першай сусветнай вайны на Палессе, пасля крывавых баёў у жніўні і верасні 1915 г. Калі лінія фронту стабілізавалася ўздоўж Агінскага канала, нямецкі ландверны пяхотны полк № 9 абсталяваў тут палкавыя могілкі, а ў 1916 годзе ўстанавіў помнік у выглядзе абеліска вышынёй каля 4 метраў з тэўтонскім крыжам і надпісам: **Den deutschen Helden 1916** (нямецкім героям). Аднак, напэўна, сярод пахаваных тут былі і расійскія салдаты (палонныя і тыя, што засталіся на палях баёў). Так, напрыклад, вядома, што ў ліпені 1916 года пасля няўдалага рускага наступу на Агінскім канале ў 10-й Сібірскай стралковай дывізіі прапалі без вестак больш за 170 чалавек, напэўна многія з іх загінулі на нямецкіх пазіцыях у раёне 5-га шлюза, што непадалёк ад Азарыч. Па воінскіх правілах таго часу, санітарныя каманды праціўніка хавалі іх на сваіх могілках.



*Фат. 7 “Так выглядалі могілкі каля Азарыч у гады Першай сусветнай вайны.”* Фота з кнігі нямецкага ландвернага пяхотнага палка № 9 (LIR 9)

Помнік-абеліск прастаяў да пачатку XXI стагоддзя. Аднак ён быў разбураны – чорныя капальнікі вырылі перад ім вялізную яму і перавярнулі ў яе помнік. Абеліск, які складаўся з трох частак, пры падзенні разваліўся. У яго сярэдняй кубападобнай частцы была ніша, у якой знаходзілася капсула са спісам загінуўшых салдат. Гэта ўсё, чым атрымалася пажывіцца вандалам.



Дзякуючы супрацоўніцтву органаў улады і грамадскасці, вучням нашай школы воінскае пахаванне часоў Першай сусветнай вайны ў лясным масіве каля в.Азарычы было адноўлена.

**Фізкультхвілінка**

**Настаўнік.** Устаньце ўсе, калі ласка. Я буду задаваць вам пытанні. Калі вы будзеце згодны, – пляскайце ў далоні, калі не – тупайце нагамі.

- Назва нашай вёскі паходзіць ад слова “вал”? (не)
- Вёска ўпершыню ўпамінаецца ў 1558 годзе? (так)
- Агінскі канал знаходзіцца на тэрыторыі Валішчанскага сельскага савета? (так)
- На тэрыторыі Валішчанскага сельскага савета знаходзіцца тры вёскі? (не)
- Доты ўздоўж Агінскага канала пабудаваны ў гады Першай сусветнай вайны? (так).
- Да будаўніцтва царквы Успення Найсвяцейшай Багародзіцы ў Валішчы раней была вёска? (не).
- Верш “Між лугоў шырокіх і лясоў зялёных…” належыць Марыі Кабец? (не)

Малайцы! Далейшы наш прыпынак ляжыць да магілы невядомага лётчыка.

**Вучань 5.** Паміж дзвюх вёсак, Сакалоўка і Клятная, побач з прасёлачнай дарогай знаходзіцца магіла невядомага лётчыка.

Са слоў відавочцаў, нямецкі знішчальнік у сярэдзіне дня збіў 3 (па іншых успамінах 4) самалёты і, развярнуўшыся, пагнаўся яшчэ за адным самалётам, які паляцеў у бок Целяхан. Ёсць меркаванне, што ўсё адбылося 24.06. – 27.06.1941г. Першы збіты экіпаж здзейсніў вымушаную пасадку, але з-за глейкага грунту ўзляцець не змог, кінуў самалёт і сышоў. Другі экіпаж,



здзейсніўшы вымушаную пасадку, зрабіў рамонт, даведаўся ў мясцовых жыхароў, што яшчэ немцаў у вёсцы няма, узляцеў. Трэці самалёт упаў у балота ў лясным масіве, а двое з экіпажу выкінуліся на парашутах і засталіся жывымі. Гэты экіпаж, па некаторых успамінах, упаў на дзень пазней астатніх трох і, па ўспамінах відавочцы, на месцы падзення самалёта быў знойдзены клапан, па ўсёй бачнасці выпускны, які належыць рухавіку самалёта дб-3 - дб-3Ф. Чацвёрты самалёт упаў побач з дарогай Сакалоўка–Клятная. Адзін з лётчыкаў выратаваўся на парашуце. Мясцовыя жыхары на месцы падзення пахавалі часткі цела, як мяркуецца, аднаго лётчыка.

Правёўшы разведку, усталявалі: абломкі належаць самалёту СБ. За гэтыя дні ў гэтым раёне былі знішчаны самалёты 130-125-121- 24 СБАП

**Вучань 6.** Беларусь з самых першых гадзін вайны стала месцам жорсткіх бітваў, у якіх прымалі ўдзел не толькі рэгулярныя войскі, але і мясцовае насельніцтва. Мясцовыя жыхары як маглі дапамагалі партызанам: збіралі звесткі аб перамяшчэнні нямецкіх войскаў, жанчыны пяклі хлеб, мылі бялізну, шылі абмундзіраванне.



А зараз мы з валі знаходзімся каля месца, дзе ў гады Вялікай Айчыннай вайны было расстраляна 11 перадавікоў калгаса в.Клятная (сярод іх 3 дзяцей). Гэта – Вакульчык М., Сліж А., Камяк М., Васюціч А.В., Русак У.Г., Вакульчык А.С., Русак А.Н., Русак К.І., Навумчык І., Сліж Ф.С., Казак А.П.

Беларусь моцна пацярпела, але паднялася з руін. Салдаты, вярнуўшыся з фронту, скалечаныя, без усялякага адпачынку ўзяліся аднаўляць народную гаспадарку. Шынель змянілі на фуфайку, вінтоўку – на кірку. Працавалі не пакладаючы рук. І ў самыя кароткія тэрміны аднавілі краіну.

Памяць пра Вялікую Айчынную вайну захоўваецца на працягу ўсіх пасляваенных гадоў.

**Вучань 7.** Далейшы наш шлях ляжыць у невялічкую вёску сярод Палесскіх лясоў  Вульку-Лаўскую. Гэта тое месца, дзе сто гадоў назад праходзілі жорсткія баі. Вось, што піша Мікалай  Гумілёў у “Запісках кавалерыста”.

Генерал Шевич докладывал:

“9 сентября 1915 года спешенные эскадроны, поддержанные огнем 2-й батареи, атакой в штыки выбили противника из Вульки Ланской в 6 ч. 30 м. вечера, причем были взяты в плен 2 нижних чина 272 германского пехотного полка здоровых и 6 раненых. В деревне были оставлены немцами 11 убитых… Ночной разведкой выяснили, что неприятель из Вульки Ланской отошел на д. Хворосно… В течение дня 9 сентября и ночью был сформирован заслон полковника Толя из 1-й роты 107 пехотного полка и трех эскадронов с 5-й батареей и взводом пулеметной команды в направлении на Телеханы, которые сдерживали попытки немецкого наступления из Гортоля на Краи — Гута — Буда и к вечеру прочно закрепились на этой линии…”

У вёсцы Вулька-Лаўская ўсё сваё жыццё пражыў поўны кавалер ордэна Славы Пётр Фёдаравіч Бандарчук.

**Вучань 1.**

Пётр Фёдаравіч Бандарчук нарадзіўся 1 кастрычніка 1911 г. у вёсцы Забараўцы Пінскага раёна Брэсцкай вобласці ў сялянскай сям'і. У 1929 Пётр быў прызваны ў польскую армію. Адслужыўшы неабходны тэрмін, ён вяртаецца дадому.

У верасні 1939 адбылося вызваленне Заходняй Беларусі ад прыгнёту панскай Польшчы, і гэтым паходам Чырвоная Армія таксама абараніла ад фашысцкага нашэсця беларусаў і ўкраінцаў, а ў чэрвені 1941 адбыўся вераломны напад Германіі на нашу Радзіму. Толькі пасля таго, як тэрыторыя Беларусі была вызвалена ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, у 1944 годзе, тут пачалася мабілізацыя.

У жніўні 1944 Пятра Фёдаравіча прызвалі ў дзеючую армію стралком 275-га стралковага палка 117-й стралковай дывізіі 69-й арміі 1-га Беларускага фронту. Ішлі ракавыя гады.

У студзені 1945 савецкія войскі ізноў перайшлі ў наступленне на заходнім напрамку. 12 студзені сіламі 1-га Беларускага і 1-га Украінскага франтоў, якімі адпаведна камандавалі маршалы Георгій Жукаў і Іван Конеў, пачалася Вісла-Одэрская стратэгічная наступальная аперацыя. Да трэцяга лютага ў ходзе гэтай аперацыі ад нямецкіх войскаў была ачышчана тэрыторыя Польшчы на захад ад Віслы і захоплены плацдарм на правым беразе Одэра, выкарыстаны пасля пры наступленні на Берлін. Аперацыя ўвайшла ў ваенную гісторыю чалавецтва як самае імклівае наступленне – на працягу 20 сутак савецкія войскі прасоўваліся на адлегласць ад 20 да 30 км у дзень. За гэты час яны пераадолелі 7 умацаваных рубяжоў саперніка і 2 буйныя водныя перашкоды.

Менавіта пры захопе Вісленскага плацдарма вызначыўся кулямётчык-радавы Пётр Фёдаравіч Бандарчук, які двое сутак адбіваў варожыя контратакі 275 полка 117 стралковай дывізіі, захапіў плацдарм на процілеглым баку Віслы і ўтрымліваў яго да прыходу савецкіх войскаў.

Пры ліквідацыі Познанскай групоўкі разам з таварышам Гурманчуком пайшоў у разведку. Па вяртанні з задання далажылі абстаноўку, пасля чаго артылерыя адкрыла прыцэльны агонь па варожых умацаваннях. Пачаліся жорсткія вулічныя баі. Полк панёс вялікія страты, Пётр прыняў камандаванне аддзяленнем і не даў магчымасці саперніку выйсці з акружэння. У баях за горад Познань ў лютым 1945 года першым уварваўся ў будынак школы, пераўтвораны ў апорны пункт, і гранатай знішчыў кулямёт і 7 гітлераўцаў, што садзейнічала паспяховаму наступленню батальёна. 22 лютага 1945 года, узнагароджаны ордэнам Славы 3 ступені. Узнагароду адважнаму герою ўручаў камандзір 117-й стралковай дывізіі Е.Г. Каберідзе.

Войскі 1-га Беларускага фронту пасля месячнай аблогі і зацяжных баёў завяршылі разгром акружанай групоўкі ворага і 23 лютага цалкам авалодалі

горадам і крэпасцю Познань – стратэгічна важным вузлом абароны немцаў на берлінскім кірунку.

Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 6 лістапад 1947 года Пётр Фёдаравіч узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны 1 ступені.

Ужо ў пасляваенны час Указам Прэзідыўма Вярхоўнага Савета СССР ад 19 жнівень 1955 года ордэн Славы 3 ступені ад 22 люты 1945 пераўзнагароджаны ордэнам Славы 2 ступені, а ордэн Славы 3 ступені ад 26 лютага 1945 пераўзнагароджаны ордэнам Славы 1 ступені.

У 1945 Пётр Фёдаравіч быў дэмабілізаваны. Праз два гады ў Пятра і Анастасіі нарадзіўся доўгачаканы сын Мікалай. Сціплы і працавіты герой жыў у вёсцы Вулька-Лаўская Пінскага раёна. Працаваў цесляром у калгасе імя Леніна, цяпер ААТ “Валішча”.

Памёр Фёдар Пятровіч Бандарчук ў 1996 годзе.

Маючы тры ордэна Славы, Пётр Фёдаравіч прыраўноўваўся ў правах да асоб, удастоеных звання Героя Савецкага Саюза.

**Вучань 1.**



Удзелькамі тых жудасных падзей былі многія жыхары нашай вёскі, 32 з іх не вярнуліся дамоў. Іх імёны залатымі літарамі высечаны на гранітным помніку, які устаноўлены ў цэнтры вёскі Валішча. Гэта наш наступны прыпынак.

**Вучань 2.** У час вайны з фашызмам ты сыноў паслала
Бараніць Радзіму, родныя палі.
Дык у цэнтры вёскі узвялі мы помнік
Тым, што пахаваны ў чужой зямлі.
Каб жыла ты вечна, дарагая вёска,
Багацелі людзі, шчасліва жылі,
Каб гулі штотыдзень у сяле вяселлі,
А ў дамах, каб дочкі і сыны раслі.

І945 год. Перамога, якую чакалі ўсе. Здавалася, шчасцю не будзе канца. Ніхто ніколі больш не пачуе выбухаў гармат, не будуць плакаць маці па сваіх сынах. Але не…Зноў нашы хлопцы ўзяліся за зброю, ужо аддаючы свой інтэрнацыянальны абавязак. Афганская вайна, якая доўжылася 10 год. Менавіта там выконвалі свой інтэрнацыянальны абавязак 14 юнакоў нашай вёскі. А мы з вамі знаходзімся каля помніка Васіля募Хараўца.

**Вучань 3.** Падчас афганскіх баявых дзеянняў загінуў наш аднавяскоўец Харавец Васіль Уладзіміравіч 1965 года нараджэння. Пра яго гераічны подзвіг паведаміў камандзір роты Джакубаев:

“... Здарылася ўсё гэта 1 кастрычніка 1985 ў 6 гадзін раніцы. Раніцай, як звычайна, мы выехалі выстаўляць пасты ахоўвання ўздоўж дарогі. Калі пад’ехалі да паста, сапёры пачалі прамацваць дарогу. Пасля таго як сапёры прамацалі дарогу ад мін, Васіль павёў свой БТР на агнявую пазіцыю. Пры падыходзе да пазіцыі душманы нечакана адкрылі моцны агонь з безадкатных гармат, процітанкавых гранатамётаў і стралковай зброі з руінаў кішлака з розных напрамкаў. Увесь агонь у першую чаргу прыйшоўся па баявой машыне Васіля. БТР падбілі, а ён сам быў цяжка паранены. Паранены быў і яго таварыш Равшанаў Халім, які таксама быў у БТРы і вёў агонь з кулямётнай устаноўкі. Але яны не кінулі свайго месца да заканчэння бою, адбівалі напад мяцежнікаў з апошніх сіл, пакуль не страцілі прытомнасць.

Пасля бою на БТРы Васіля Хараўца мы выявілі тры прабоіны ад гранатамёта і адну - ад безадкатных гармат.

Васіля і Халіма Раўшанова даставілі ў цэнтральны шпіталь. Яны абодва былі ў цяжкім стане. Урачы  адразу адправілі іх у рэанімацыйнае аддзяленне, зрабілі ўсё магчымае ...

Праз суткі Васіль і Халім памерлі.”

За гэты бой Васіль Харавец пасмяротна ўзнагароджаны Ганаровай граматай Цэнтральнага камітэта ВЛКСМ за мужнасць і гераізм, праяўленыя пры выкананні інтэрнацыянальнага абавязку ад 22 кастрычніка 1985 года.

Указам ад 28 снежня 1988 г. Васіль Уладзіміравіч Харавец быў узнагароджаны Граматай Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР і ордэнам Чырванай Зоркі. Імем Васіля Хараўца названа вуліца роднай вёскі Валішча і Піянерская дружына Валішчанскай СШ.

**Вучань 4.**



Наступны наш прыпынак каля месца, дзе заўсёды спакойна, дзе ўсе нягоды знікаюць, а сэрца слухае цішыню. Гэта наша царква Успення Найсвяцейшай Багародзіцы. Працаваць яна пачала ў 2011 годзе. Кожны жыхар нашай, а таксама суседніх вёсак ахвяраваў на адкрыццё царквы. Павінна быць у чалавека месца, дзе ён заўсёды можа знайсці супакаенне і добрую параду. І такое месца ў нас ёсць…

Шчыра запрашаем усіх да нас у госці. А скончыць сваю завочную экскурсію хачу словамі землячкі, беларускай паэткі Марыі Кобец:

Вёска мая – прыгажуня Палесся!

Ты, прытуліўшыся, ціха стаіш у балатах.

Сонца ўзыходзіць заўсёды ў цябе на Залессі,

І да гасцінца злятаецца к выраю птах.

**Рэфлексія. Гульня “Знайдзі пару” .** Настаўнік праводзіць гульню і падводзіць вынікі.

З куфэрачка кожны вучань дастае скрутак, пасля чаго ім патрэбна знайсці сваю пару і растлумачыць свой выбар.

Валішча – 1558 год.

Агінскі канал – Міхаіл Казімір Агінскі.

Першая Сусветная вайна – доты.

Мікалай Гумілёў – Вулька Ланская.

Хваросна – Ваенныя пахаванні.

Пётр Фёдаравіч Бандарчук – поўны Кавалер Ордэна Славы.

Афганская вайна – Васіль Харавец.

Царква Успення Найсвяцейшай Багародзіцы – 2011 год.